# ЖЫЦЦЁ СТУДЭНТАЎ БЕЛАРУСКАГА ПОЛІТЭХНІЧНАГА ІНСТЫТУТА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х–ПАЧАТКУ 1940-х гг. (па матэрыялах палітэхаўскай шматтыражкі)

**С. Г. Далюк[1], А. В. Лепеш[2]**

[1] *Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Беларусь, sviatlanadoliuk@gmail.com*
[2] *Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Беларусь, oxanalepesch@rambler.ru*

На аснове матэрыялаў газеты, якая выдавалася Беларускім політэхнічным інстытутам з 1935 г., у артыкуле прадстаўлена студэнцкае жыццё галоўнай тэхнічнай ВНУ краіны ў даваенны перыяд. Абагульняюцца даныя аб кантынгенце студэнтаў, прыводзяцца звесткі аб вучэбнай, навуковай, культурнай, спартыўнай дзейнасці навучэнцаў БПІ, матэрыяльна-бытавых умовах іх жыцця.

***Ключавыя словы:*** Беларускі політэхнічны інстытут; студэнты; вучэбная дзейнасць; культурнае жыццё; інтэрнат; бытавыя ўмовы; спартыўныя дасягненні; навуковая дзейнасць.

# ЖИЗНЬ СТУДЕНТОВ БЕЛОРУССКОГО ПОЛИТЕХНИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1930-х–НАЧАЛЕ 1940-х гг. (по материалам политеховской многотиражки)

**С. Г. Долюк[1], О. В. Лепеш[2]**

[1] *Белорусский национальный технический университет, пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь, sviatlanadoliuk@gmail.com*
[2] *Белорусский национальный технический университет, пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь, oxanalepesch@rambler.ru*

На основе материалов газеты, издаваемой Белорусским политехническим институтом с 1935 г., в статье представлена студенческая жизнь главного технического вуза страны в довоенный период. Обобщаются данные о контингенте студентов, приводятся сведения об учебной, научной, культурной, спортивной деятельности студентов БПИ, материально-бытовых условиях их жизни.

***Ключевые слова:*** Белорусский политехнический институт; студенты; учебная деятельность; культурная жизнь; общежитие; бытовые условия; спортивные достижения; научная деятельность.

# LIFE OF STUDENTS OF THE BELARUSIAN POLYTECHNIC INSTITUTE IN THE SECOND HALF OF THE 1930s–EARLY 1940s (based on the materials of the polytechnic multi-circulation newspaper)

**S. G. Doliuk[a], O. V. Lepesh[b]**

[a] *Belarusian National Technical University, Niezaliežnasci Avenue, 65, 220013, Minsk, Republic of Belarus, sviatlanadoliuk@gmail.com*

[b] *Belarusian National Technical University, Niezaliežnasci Avenue, 65, 220013, Minsk, Republic of Belarus, oxanalepesch@rambler.ru*

Based on the materials of the newspaper published by the Belarusian Polytechnic Institute since 1935, the article presents the student life of the main technical university of the country in the pre-war period. It summarizes data on the student body, provides information on the educational, scientific, cultural, sports activities of BPI students, and their living conditions.

***Keywords:*** Belarusian Polytechnic Institute; students; educational activities; cultural life; dormitory; living conditions; sports achievements; scientific activity.

У 1933 г. Беларускі політэхнічны інстытут (БПІ) аднавіў сваю дзейнасць пасля больш, чым дзесяцігадовага перапынку. Люстэркам даваеннай гісторыі БПІ стала газета «За пролетарскага інжынера», якая пачала выдавацца з 23 красавіка 1935 г. Ужо 2 лістапада 1938 г. газета была пераіменавана ў «Савецкі інжынер» і мела такую назву да верасня 1993 г. Аналіз базы артыкулаў шматтыражкі БПІ дазваляе скласці ўяўленне пра функцыянаванне інстытута, яго ўнутраныя паблемы, матэрыяльна-тэхнічную базу, паўсядзённае жыццё студэнтаў. Газета выдавалася на беларускай мове, невялікая колькасць артыкулаў была напісана па-руску.

Аўтарамі артыкулаў у газеце маглі быць выкладчыкі і кіраўніцтва інстытута, калі гэта тычылася, напрыклад, агляду пытанняў партыйнага будаўніцтва ў краіне і сімвалічных савецкіх свят, аналізу функцыянавання кафедр, цякучай і выніковай атэстацыі студэнтаў, вынікаў сацыялістычных спаборніцтваў паміж факультэтамі, кафедрамі, студэнцкімі групамі; прафсаюзныя, камсамольскія лідары, якія асвячалі працу дадзеных арганізацый; самі студэнты, якія пісалі пра тое, чым яны не задаволены ў інстытуце і ў інтэрнатах, што іх хвалявала і турбавала. Прычым, студэнцкія выступы на сторонках газеты характарызаваліся вастрынёй, высокай ступенню крытычнасці, яны нагадвалі хутчэй скаргі, чым артыкулы. А адсюль аўтарства такіх выступленняў часам было ананімнае (што дапускалася рэдакцыяй), калі студэнт не паказваў свайго прозвішча і ставіў толькі першую/апошнюю яго літары, або ў канцы падпісваўся абстрактна: «студэнт», «механік», «дыпломнік» і г. д. І, трэба аддаць належнае, кіраўніцтва інстытута хутка рэагавала на недахопы, выкрытыя на старонках газеты, і імкнулася іх выправіць у найбліжэйшы час.

У перадваенныя гады у БПІ функцыянавала 4 факультэты — будаўнічы, хіміка-тэхналагічны, торфамеханічны і гідрамеліярацыйны, механічны і вячэрняе аддзяленне. Колькасць студэнтаў у БПІ у другой палове 1930-х–пачатку 1940-х гг. павялічылася. Калі ў 1936 г. налічвалася каля 1700 студэнтаў [1, л. 36], то ў пачатку 1940 г. іх было ўжо каля 2000 [3, л. 6]. Вучэбны працэс у інстытуце мала чым адрозніваўся ад сучаснага: студэнты наведвалі лекцыі, калоквіўмы, выконвалі лабараторныя работы, здавалі залікі і іспыты ў сесійны перыяд, праходзілі практыку, абаранялі дыпломныя праекты. Асноўныя веды па прадмеце навучэнцы атрымлівалі ў выніку наведвання лекцый і іх канспектавання, а таксама з навуковых кніг, якія можна было атрымаць у бібліятэцы. Сярэдні бал па інстытуце ў канцы 1930-х–пачатку 1940-х гг. на дзённым аддзяленні вагаўся ў адлегласці 3,7–3,8 пры абсалютнай пасляховасці ў 74–80 % [3, л. 2, 41]. Новай дысцыплінай у БПІ, да выкладання якой была павышаная ўвага, стала дысцыпліна «Асновы марксізму-ленінізму», па якой студэнты павінны былі актыўна рыхтавацца на семінарах праз вывучэнне твораў аўтараў марксісцка-ленінскай ідэалогіі і па якой здавалі абавязковы іспыт [3, л. 5, 8]. У 1940/1941 навучальным годзе былі ўпершыню ўведзены дзяржаўныя экзамены па замежных мовах [3, л. 51].

Кіраўніцтва БПІ вяло барацьбу з пропускамі заняткаў, своечасовай ліквідацыяй запазычанасцяў (адна з галоўных праблем!), пастаянна выказвалася за стымуляванне студэнцкай навукі, добрую арганізацыю практыкі студэнтаў, якая магла праходзіць нават за межамі рэспублікі. У гэтым ім дапамагалі самі студэнты праз інстытуцкую газету, дзе паказвалі на тых, хто парушаў парадак і дысцыпліну, спазняўся на лекцыі, прапускаў заняткі без уважлівых прычын, перашкаджаў на лекцыях слухаць выкладчыкаў, дазваляў сабе грубыя адносіны да апошніх, карыстаўся шпаргалкамі на экзаменах.

Актывізацыяй навукова-даследчай работы студэнтаў павінны былі займацца выкладчыкі інстытута. Вядома, што ў 1938 г. на Усесаюзнай выставе па вынаходніцтве БПІ меў свой стэнд, дзе былі прадстаўлены распрацаваныя мадэлі навучэнцаў. Там знаходзіліся работы студэнтаў механічнага факультэта пад кіраўніцтвам прафесара Г. М. Галавіна, а таксама праект вопытнага станка для абточкі мнагагранных валоў, аўтарам якога з'яўляўся лепшы вынаходнік інстытута студэнт 5 курса мехфака Эйг [2, л. 12].

Асяроддзе студэнтаў ў даваенны перыяд цікавілася не толькі вучобай, але і пазавучэбнымі мерапрыемствамі, клапацілася аб паляпшэнні бытавых умоў падчас пражывання ў інтэрнатах, дбала пра годную фізічную падрыхтоўку. Многія студэнты былі іншагароднімі і пражывалі ў інтэрнатах. За палітэхам былі замацаваны два інтэрнаты — інтэрнат № 1, дзе

пражывала большасць студэнтаў — каля 700 [3, л. 20], і інтэрнат № 2. Якасць жыцця ў інтэрнатах, зыходзячы з артыкулаў, была далёкай да дасканаласці. У нездавальняючым стане знаходзіліся прыбіральні, каналізацыя, вентыляцыя, назіраліся перабоі з вадой, што перашкаджала студэнтам своечасова мыцца, у зімовы перыяд было халодна. Пакоі былі заселены вельмі шчыльна (колькасць жыльцоў даходзіла да 10–14 чалавек [1, л. 2, 48]), у іх адсутнічалі шафы, фіранкі на вокнах, былі праблемы з абрусамі, коўдрамі, прасцінамі, якія мяняліся вельмі рэдка. Штат прыбіральшчыц быў неўкамплектаваны, ім прыходзілася працаваць на 2–3 участках, таму памяшканні яны мылі не так часта, як было патрэбна [1, л. 8; 2, л. 10, 30, 44]. Некаторыя пакоі былі занятыя пад склады [1, л. 26], пакоі адпачынку практычна адсутнічалі, што дрэнна адбівалася на працэсе самастойнай падрыхтоўкі навучэнцаў да заняткаў [1, л. 48; 2, л. 10]. Гэтыя недахопы былі абумоўлены гістарычным часам, бо вышэйшая школа ў міжваенны перыяд праходзіла этап станаўлення і, безумоўна, адсутнасць сродкаў на забеспячэнне належнага ўзроўня бытавога абслугоўвання такім чынам адбівалася на ўмовах жыцця тагачасных навучэнцаў.

Выправіць сітуацыю па санітарна-гігіенічным становішчы ў інтэрнаце № 1 савет інтэрната планаваў праз аб'яўленне штогадовых конкурсаў на лепшую комнату і культурнага жыхара [1, л. 36; 2, л. 28]. Так, у снежні 1936 г. пры падвядзенні вынікаў конкурса былі прэміраваны жыхары шасці ўзорных комнат у памеры 100–200 рублёў, а таксама ад 20 да 50 руб. атрымалі пяць чалавек у якасці персанальнага заахвочвання [1, л. 36].

Значная колькасць невялікіх артыкулаў у газеце была прысвечана працы сталовай ВНУ, буфетаў інстытута і інтэрната, магазіна, які абслугоўваў студэнтаў БПІ. Усе яны насілі ў большай ступені негатыўны кантэкст. Студэнты у цэлым былі незадаволены працай гэтых грамадскіх месцаў. У 1935 г. яны скардзіліся на антысанітарыю ў сталоўцы, дзе харчаванне падавалася ў брудным посудзе, а ў абедах часта знаходзілі шкодныя рэчы (шкло, трэскі) [1, л. 4]. Напэўна, гэтыя заўвагі былі ўлічаны, бо больш у газеце такіх нараканняў не выказвалася. Наадварот, ужо ў кастрычніку 1935 г. адзначалася, што інстытуцкая сталоўка мае прыгожы ўнутраны выгляд, але заставалася крытыка наконт адсутнасці танных і якасных абедаў (на той момант кошт абеда не павінен быў перавышаць 1 руб. 30 кап., а у сталоўцы БПІ ён каштаваў 1 руб. 60 кап.–1 руб. 70 кап.) [1, л. 26; 2, л. 2, 26], дрэннага абслугоўвання і вялікіх чэргаў [3, л. 10]. Цікава, што самі працоўныя сталовай выхоўвалі свінней (у 1938 г. пры сталоўцы існаваў свінарнік з 8 свінаматкамі), а таксама выпасвалі некалькі малочных кароў. Свінні і каровы забіваліся на двары сталовай, малако штодзённа здавалася ў сталовую. Мяса і малако ўжывалася пры прыгатаванні страў [2, л. 4].

У працы буфетаў інстытута і інтэрната № 1 незадавальняла навучэнцаў БПІ адсутнасць намінальнага асартымента тавараў (каўбасы, сялёдкі і нават гарбаты) [2, л. 10]. Студэнты скардзіліся на пастаяннае парушэнне санітарных нормаў у магазіне пры інтэрнаце, дзе прадукты прадаваліся без абгортванай паперы, квашаныя гуркі, памідоры, яблыкі ўзважваліся прама на чашах вагаў [1, л. 4], на падлозе заўсёды быў бруд, на паліцах — пыл, ды і самі прадаўцы не вылучаліся кампетэнтнасцю і акуратнасцю [1, л. 48].

У БПІ кіраўніцтва, прафкам, камсамол імкнуліся наладзіць культурна-масавую работу шляхам арганізацыі вечароў, прысвечаных знакамітым пісьменнікам, сустрэч з беларускай літаратурнай элітай, выступленняў самадзейнасці, лекцый і дыспутаў на літаратурныя, музычныя, навукова-тэхнічныя тэмы, культпаходаў ў кіно і тэатры. Так, 12 сакавіка 1935 г. адбылася сустрэча студэнтаў БПІ з беларускімі пісьменнікамі Якубам Коласам, Э. Самуйлёнкам, С. Баранавых, дзе абмяркоўваліся творы «Дрыгва» Якуба Коласа і «Над ракой Арэсай» Янкі Купалы. У дыскусіі прыняла ўдзел шмат студэнтаў. Нягледзячы на тэхнічны напрамак ВНУ, яе навучэнцы паказалі, што яны любяць і чытаюць беларускую мастацкую літаратуру. Сам Якуб Колас быў задаволены наладжаным дыспутам, адзначыў, што ён больш верыць звычайнаму чытачу, чым прафесіяналу-крытыку, і нават абяцаў выправіць заўвагі, на якія яму паказалі студэнты ў аповесці «Дрыгва» [1, л. 2]. У інстытуце ў даваенны час праходзіў урачысты вечар, прысвечаны 30-гадоваму юбілею літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы [1, л. 6], а таксама шэраг мерапрыемстваў у гонар памяці пра А. С. Пушкіна [1, л. 32], В. В. Маякоўскага [3, л. 9, 10], Л. М. Талстога [3, л. 30], П. І. Чайкоўскага [3, л. 6].

З матэрыялаў газеты вядома, что у даваенны час у БПІ існавалі аўтагурток [1, л. 37], мотагурток [2, л. 32], фоталабараторыя [2, л. 24], ансамбль песні і танца [2, л. 30], струнны гурток [1, л. 8]. У 1937 г. у БПІ ўзнік драматычны гурток пад кіраўніцтвам прафесійнага артыста яўрэйскага дзяржаўнага тэатра Б. І. Фельдмана. За 2 гады з моманту стварэння драмгуртка яго калектывам было падрыхтавана звыш 15 п’есаў савецкіх пісьменнікаў і рускіх класікаў. Спектаклі ладзіліся не толькі ў інстытуце, але і для частак РККА, памежных войсках, будаўнікоў і інш. [2, л. 18, 44]. Фондам інстытуту была добра абсталяваная кінааўдыторыя [2, л. 25], працаваў радыёвузел [1, л. 36].

Прафкам студэнтаў у БПІ займаўся таксама арганізацыяй адпачынку. Так, летам 1938 г. на курорты па заключэнні лячэбна-курорных камісій было адпраўлена 30 студэнтаў, у дамы адпачынку — 248 выдатнікаў і актывістаў грамадскай работы. У санаторый «Сасноўка» на двухмесячнае лячэнне былі адпраўлены ўсе хворыя на туберкулёз. Усяго на летнюю аздараўленчую кампанію прафкам выдаткаваў 70 тыс. руб. [2, л. 26].

У БПІ у даваенны час вельмі добра была пастаўлена работа па фізкультурнай падрыхтоўцы, нягледзячы на тое, што фізкультурная зала так і не была пабудавана для трэніровак. Студэнты БПІ дэманстравалі ўражлівыя поспехі ў спартыўных спаборніцтвах. У 1936 г. у ВНУ працавала 12 спартыўных секцый, спарстмены якіх займаліся ў арэндаваных інстытутам залах і на стадыёнах [1, л. 25]. Фізкультурная арганізацыя інстытута мела значныя дасягненні ў маштабе г. Мінска і БССР. Фізкультурная каманда інстытута два гады, у 1935 і ў 1936 гг., трымала першынство ў горадзе па боксу, баскетболу і валейболу, займала другое месца па лыжах [1, л. 13]. У 1938 і 1939 гг. двойчы жаночая і мужчынскія каманды БПІ выйгралі валейбольныя спаборніцтвы на першынство ВНУ г. Мінска і затым атрымлівалі перамогі на Усесаюзным розыгрышы па валейболе сярод інстытуцкіх каманд СССР [2, л. 2, 34, 36]. У 1937–1940 гг. каманда БПІ перамагла ў гарадскіх спаборніцтвах па футболе паміж ВНУ г. Мінска [2, л. 28; 3, л. 26]. У 1938 г. спартсмены ад БПІ выйгралі ў гарадскіх спаборніцтвах па плаванню сярод каманд ВНУ, занялі першае месца ў спаборніцтвах па гімнастыцы на першынство г. Мінска і падзялілі першае і другое месца з камандай з БДУ на шахматна-шашачным турніры ВНУ і тэнікумаў г. Мінска [2, л. 18].

Вялікая ўвага ў інстытуце надавалася ваенна-абароннай рабоце са студэнтамі: падрыхтоўцы камандзіраў, значкістаў ГТО, варашылаўскіх стралкоў, арганізацыі планерызму. Для асваення ваенных ведаў у інстытуце працавалі нізавыя звенні арганізацыі Асоавіяхіма — савецкай грамадска-палітычнай арганізацыі садзейнічання абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву, якая існавала ў СССР у 1927–1948 гг. Яе задачай з’яўлялася ў тым ліку і правядзенне военнай падрыхтоўкі насельніцтва СССР. Асабліва актыўна работу па ваеннай падрыхтоўцы ў БПІ разгарнулі ў 1940–1941 гг., што было звязана з узмацненнем ваеннай небяспекі на міжнароднай арэне. 22 снежня 1940 г. студэнты хіміка-тэхналагічнага факультэту БПІ прынялі ўдзел у першым рэспубліканскім масавым ваенізаваным пераходзе, мэта ягога была ў тым, каб выхаваць вытрымку, уменне арыентавацца на мясцовасці, выносіць цяжкасці ваеннага жыцця [3, л. 35].

Навучанне ў ВНУ СССР першапачаткова было поўнасцю бясплатным. У 1940 г. СНК СССР выдаў загад аб устанаўленні платнасці навучання ў старэйшых класах школ і вышэйшых навучальных установах СССР і аб змене парадку прызначэння стыпендый. Абгрунтаванне неабходнасці ўвядзення платы за навучанне было звязана з павелічэннем узроўню матэрыяльнага дабрабыту працоўных, што дазволіла ўскласці частку выдаткаў на будаўніцтва, абсталяванне і ўтрыманне сеткі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў на насельніцтва [3, л. 21]. Такім чынам, з 1 верасня 1940 г. была ўведена плата за навучанне ў 8, 9, 10 класах

сярэдніх школ і ВНУ. Памер платы для ВНУ Мінска, як сталіцы БССР, складаў 400 руб. на год, якая ўносілася роўнымі часткамі: да 1 верасня і да 1 лютага. Студэнты з вельмі бедных сем'яў ад платы вызваляліся.

З 1 лістапада 1940 г. уносіліся карэктывы і па налічэнні стыпендыі. Яе маглі атрымаць толькі найбольш здольныя: судэнты першага курса, якія былі прыняты ў ВНУ без іспытаў як выдатнікі сярэдняй школы, а таксама тыя, хто атрымаў на прыёмных іспытах не менш як дзве трэці адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра»; студэнты другога курса, якія атрымалі на вясенняй экзаменацыйнай сесіі не менш як дзве трэці адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра» [3, л. 23]. Таксама ў БПІ былі сталінскія стыпендыяты — выбітныя студэнты, якія сумяшчалі вучобу з навукова-даследчай і грамадскай работай. У 1940 г. такіх было 9 чалавек [3, л. 13].

Калі ў студэнта былі праблемы з фінансамі, ён мог паспрабаваць пазычыць пэўную колькасць грошай (пры іх наяўнасці) у касе ўзаемадапамогі, але яна працавала без добрага ўліку. У 1940 г. сума запазычанасці касы ўзаемадапамогі складала 1600 руб., прычым за тымі, хто ўжо скончыў інстытут. Студэнты неахвотна плацілі членскія ўнёскі ў касу ўзаемадапамогі: са 105 яе членаў 69 чалавек мелі запазычанасці па аплаце [3, л. 25].

Такім чынам, важнай крыніцай па гісторыі паўсядзённага жыцця студэнтаў БПІ ў даваенны час можна лічыць інстытуцкую газету, якая выдавалася з 1935 г. Матэрыялы газеты дазваляюць зрабіць вывад аб добра пастаўленай у інстытуце культурна-масавай, ваенна-абароннай і спартыўнай рабоце, вылучыць шэраг праблем у арганізацыі працы месц харчавання, а таксама скласці ўяўленне пра бытавыя умовы пражывання ў інтэрнатах.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени политехнический институт. Подшивка газет «За пролетарского инженера» за 1935, 1936, 1937 годы // Музей истории Белорусского национального технического университета. АГ-23(ОФ). 48 л. Архивная копия.

2. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени политехнический институт. Подшивка газет «За пролетарского инженера», «Советский инженер» за 1938, 1939 годы // Музей истории Белорусского национального технического университета. АГ-24(ОФ). 50 л. Архивная копия.

3. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени политехнический институт. Подшивка газет «Советский инженер» за 1940, 1941 годы // Музей истории Белорусского национального технического университета. АГ-25(ОФ). 54 л. Архивная копия.